Раздзел 5

# Мастацкая культура на землях Беларусі ў XVII–XVIII стагоддзях



Грызе́льда з Ваду́нскіх Сапе́га (1630-я гг.)

Здаецца, чую рык гармат,
І шабляў звон, і куляў град.
Скажы: чаму ізноў не спіш,
Нясвіж?

*Леанід Дайнéка*

## § 32. Архітэктура і манументальны жывапіс беларускіх зямель Рэчы Паспалітай

У беларускім мастацтве з канца XVI і амаль да канца XVIII стагоддзя, як і ў мастацтве большасці еўрапейскіх краін, панаваў стыль барока. Драматызм, дынаміка і экспрэсія, характэрныя для гэтага стылю, былі сугучныя падзеям, якія адбываліся на беларускіх землях.

**Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы.** Найбольш ярка барока на землях Беларусі, як і ва ўсім свеце, выявілася ў архітэктуры храмаў. Пры гэтым помнікі кожнай з канфесій — праваслаўнай, каталіцкай або ўніяцкай — адрозніваліся сваім варыянтам стылю, мастацкімі асаблівасцямі.

Першым збудаваннем у стылі барока ў Рэчы Паспалітай з'яўляецца *касцёл Божага Цела ў Нясвіжы*. Яго ўзвядзенне завяршылася ў 1593 годзе. Трохнефная купальная базіліка з высокім светлавым барабанам, што нясе купал, мае адну апсіду і дзве пяціграннья капліцы — храмавыя памяшканні для малення. Стыль барока ясна выяўляецца ў фасадзе храма. Яго крывалінейныя абрысы, нішы са скульптурай, карніз складанай канфігурацыі аб'ядноўваюцца ў цэласную кампазіцыю — своеасаблівую кулісу. Гульня святла і ценю выклікае адчуванне напружання і дынамікі.

Унутранае ўбранне храма стваралася нашмат пазней, ужо ў XVIII стагоддзі. Фрэскавы цыкл касцёла Божага Цела, у якім паказаны біблейскія сцэны, наліч-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Джава́ні Марыя Бернардоні.** Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы, Беларусь (1593 г.)



**Ксаверый Дамінік Гескі.** Тайная вячэра (1752 г.)

вае больш за 40 кампазіцый. Цэнтральнае месца ў цыкле займае алтарная карціна «Тайная вячэра», напісаная *Ксаве́рыем Дамі́нікам Ге́скім* — прыдворным мастаком князёў Радзівілаў. Менавіта ён узначаліў групу майстроў, якія працавалі над роспісам храма.

Віртуознасць жывапісцаў дазволіла дасягнуць надзвычайных эфектаў. Мастакі выкарыстоўвалі характэрныя для барока прыёмы. Фігуры паказаны ў руху, у складаных ракурсах. Пры дапамозе жывапісных сродкаў майстрам удалося стварыць імітацыю скульптур і архітэктурных форм — калон і арак. Такія аптычныя ілюзіі значна пашырылі прастору храма.

Разгледзьце ўважліва фрэску «Тайная вячэра» К. Д. Гескага. Знайдзіце ў ёй пералічаныя мастацкія прыёмы. Апішыце, якога аптычнага эфекту дасягнуў майстар.

**Касцёл Святога Францыска Ксаверыя ў Гродне.** З другой паловы XVII стагоддзя на беларускіх землях распаўсюджваецца новы тып храма, фасад якога ўпрыгожваюць дзве шмат’ярусныя вежы. Яркім прыкладам такога храма з’яўляецца *гродзенскі касцёл Святога Францы́ска Ксаве́рыя* — адно з найбуйнейшых збудаванняў гэтага перыяду. Касцёл уваходзіў у комплекс кляштара езуітаў, які займаў цэлы гарадскі квартал. Велічны будынак узносіцца на 54 метры ў вышыню, вылучаючыся сярод іншых пабудоў. Насычаны



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Касцёл Святога Францыска Ксаверыя ў Гродне, Беларусь (канец XVII — XVIII ст.)



**Ян Шміт.** Галоўны алтар касцёла Святога Францыска Ксаверыя (1736 г.)

дэкорам фасад касцёла мае тры ярусы. Складаныя профілі карнізаў спалучаюцца з нішамі і праёмамі. Па баках ўзвышаюцца дзве вежы-званіцы.

Не менш пышны і інтэр'ер храма. Галоўны алтар касцёла выкананы ў майстэрні *Яна Шміта* з польскага горада Рэшля. Двух'ярусная канструкцыя складаецца з калон і карнізаў. У цэнтры ніжняга яруса размяшчаецца скульптурная выява святога Францыска Ксаверыя, па абодва бакі ад якога — постаці апосталаў. У цэнтры верхняга рада мы бачым постаць Хрыста ў асяроддзі евангелістаў. Усе персанажы паказаны ў дынамічных позах, з выразнай жэстыкуляцыяй і экспрэсіяй, уласцівай барока.

Інтэр'ер гродзенскага касцёла, акрамя галоўнага і бакавых алтароў, аздоблены фрэскавым цыклам, прысвечаным жыццю святога Францыска Ксаверыя. Пазнаёмцеся з фрэскамі ў інфармацыйных крыніцах. Апішыце асноўныя падзеі, адлюстраваныя ў іх.

**Касцёл Узнясення Прасвятой Дзевы Марыі ў Будславе.** У 1783 годзе ў вёсцы Будслаў была ўзведзена адна з найважнейшых беларускіх святынь — *касцёл Узнясення Прасвятой Дзевы Марыі*. Яго аўтарамі называюць варшаўскага архітэктара Юзэфа Фантана і настаяцеля храма Канстанціна Пенса.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Касцёл уяўляе сабой масіўную трохнефную крыжова-купальную базіліку. Цікава, што купал у ім «сляпы»: яго відаць толькі ўнутры храма. Дзве магутныя чатырох'ярусныя вежы фасада касцёла нібы ўзносяцца ўвышыню, а шматслойны карніз дзеліць фасад на два ярусы. Фігурны франтон з грэбенем і мноства пілястраў, якія чаргуюцца, выклікаюць адчуванне імкліва нарастаючых буйных аб'ёмаў.



Касцёл Узнясення Прасвятой Дзевы Марыі ў в. Будслаў, Беларусь (XVII—XVIII стст.)

Пры ўзвядзенні Будслаўскага касцёла ў будынак быў уключаны стары храм XVII стагоддзя, які стаў бакавой *капліцай Святой Барбары*. Тут захаваўся цудоўны помнік выяўленчага мастацтва: алтар, выкананы ў стылі барока. Цэнтральная частка алтарнай кампазіцыі паабапал абрамленая крыламі-каланадамі са скульптурамі. Пазалочаная драўляная скульптура і дэкаратыўныя дэталі кантрастуюць з часткамі алтара з цёмнага дрэва. Паставы біблейскіх персанажаў уражваюць велічнай урачыстасцю і эмацыянальнасцю.



**Архітэктар Джавані Батыста Гіслені, скульптар Пётр Грамель.** Алтар капліцы Святой Барбары (1643—1649 гг.)

Разгледзьце на кампакт-дыску выявы скульптур з капліцы Святой Барбары. Ахарактарызуйце іх, выкарыстоўваючы «падказкі» з тэксту параграфа.

**Віленскае барока.** У XVIII стагоддзі для будаўніцтва ўніяцкіх храмаў характэрным быў зварот да кірунку, які атрымаў назву *«віленскае барока»*. Яго галоўныя рысы — вытанчанасць і лёгкасць. Фасады будынкаў у стылі віленскага барока маюць пазнавальную «цякучасць» ліній. Скразныя праёмы, якія ўпрыгожваюць вежы храмаў, ствараюць уражанне ажурнасці. Такая архітэктура арганічна стасуецца з прыродным ландшафтам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сафійскі сабор у Полацку да гэтага часу быў моцна разбураны. Ад арыгінальнага будынка захаваліся толькі фрагменты ніжняй кладкі сцен і правая апсіда. Работы па рэканструкцыі храма ўзначаліў вядомы дойлід *Іага́н Крыстоф Гла́ўбіц*. Ён прапанаваў новае рашэнне, якое адрознівалася асаблівай вытанчанасцю архітэктурных форм. Дзякуючы Іагану Глаўбіцу храм Святой Сафіі здабыў пазнавальны мастацкі вобраз і стаў выдатным помнікам віленскага барока.



**Іаган Крыстоф Глаўбіц.**
Сафійскі сабор у Полацку, Беларусь
(1738—1750 гг.)

Віленскае барока — кірунак у архітэктуры, які атрымаў назву дзякуючы гораду Вільні. Тут знаходзіцца большасць помнікаў архітэктуры, якія належаць да гэтага кірунку.

У канцы XVIII стагоддзя на землях Беларусі разам з барочнымі помнікамі ў архітэктуры распаўсюджваецца класіцызм. Рысы класіцызму выявіліся, напрыклад, у фасадзе *касцёла Святога Стані́слава ў Магілёве*. У 1752 годзе яго перабудавалі, дадаўшы порцік з чатырма калонамі. А ўнутраная прастора храма ўпрыгожана ў стылі барока. Фрэскавы цыкл касцёла быў створаны ў 1760-я гады. Сярод кампазіцый, прысвечаных гісторыі



Касцёл Святога Станіслава ў Магілёве, Беларусь



Фрэска «Уручэнне граматы каралём Жыгімонтам кармелітам на будаўніцтва манастыра ў Магілёве» (1765—1767 гг.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

манаскага ордэна кармелітаў, асаблівае месца займае роспіс «Уручэнне граматы каралём Жыгімонтам кармелітам на будаўніцтва манастыра ў Магілёве».

І Сафійскі сабор, і касцёл Святога Станіслава маюць унікальную, поўную таямніц гісторыю. Пазнаёмцеся з гісторыяй храмаў у інфармацыйных крыніцах. Якія факты вас асабліва ўразілі? Як гісторыя храмаў адбілася на іх архітэктурным абліччы?

**Палацавая архітэктура.** Культурнае жыццё на тэрыторыі Беларусі канцэнтравалася ў магнацкіх і шляхецкіх рэзідэнцыях. У XVII—XVIII стагоддзях на нашых землях актыўна ўзводзіліся велічныя замкі і палацы. Дзякуючы рэканструкцыі старыя замкі атрымлівалі новы, больш пышны выгляд.



Палацава-замкавы комплекс у Нясвіжы, Беларусь

Неаднаразова змяняўся мастацкі вобраз *Нясвіжскага замка*. Яго палацавы корпус багата дэкарыраваны ляпным рэльефам. Фасад будынка завяршаецца трохвугольным франтонам. Бакавыя карпусы злучаны з галоўным дадатковымі пабудовамі. Над уязнымі варотамі і адным з бакавых карпусоў узвышаюцца вежы.

Многаэтапнае будаўніцтва і шматлікія рэканструкцыі Нясвіжскага замка прывялі да таго, што ў яго архітэктуры перапляліся стылі розных эпох. З абарончага збудавання ён ператварыўся ва ўражальную рэзідэнцыю ў стылі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

барока з паркавым масівам. Сёння Нясвіжскі замак — адзін з самых папулярных турыстычных аб’ектаў Беларусі. У ходзе апошніх рэстаўрацыйных работ было аднаўлена не толькі вонкавае аблічча замка, але і яго шматлікія інтэр’еры.

З якімі палацавымі комплексамі XVII—XVIII стагоддзяў вы пазнаёміліся на ўроках мастацтва ў 5 і 6-м класах? Якія рысы стылю барока вы можаце ў іх адзначыць?

Беларускае барока XVII—XVIII стагоддзяў злучыла ў сабе найлепшыя еўрапейскія традыцыі і асаблівасці мясцовага каларыту. Дзякуючы гэтаму беларуская архітэктура часоў Рэчы Паспалітай набыла пазнавальныя арыгінальныя рысы.

## Пытанні і заданні

1. Успомніце і назавіце работы майстроў Рэнесансу, прысвечаныя біблейскаму сюжэту пра тайную вячэру. Параўнайце іх з сюжэтам фрэскі «Тайная вячэра» К. Д. Гескага. У чым, на ваш погляд, заключаецца адрозненне ў трактоўцы сюжэта? У кампазіцыі? У адлюстраванні персанажаў?

2. На дадатковай старонцы разгледзьце роспісы касцёла Божага Цела ў Нясвіжы. Якія барочныя прыёмы выкарыстоўвалі беларускія майстры? Якія аптычныя эфекты вы можаце адзначыць?

3. Пры стварэнні алтара ў капліцы Святой Барбары касцёла Узнясення Прасвятой Дзевы Марыі ў в. Будслаў аўтары ўжылі арыгінальны мастацкі прыём «скарочанай перспектывы». Архітэктурныя дэталі алтара і фігуры паміж калонамі памяншаюцца па меры набліжэння да цэнтра кампазіцыі. Гэта спараджае ілюзію большай глыбіні і пашырэння прасторы. Падумайце, на дасягненне якога эфекту быў накіраваны гэты прыём.

4. Параўнайце знешні выгляд касцёла Святога Францыска Ксаверыя ў Гродне і аднаго з храмаў італьянскіх майстроў, збудаваных у гэты перыяд. Паспрабуйце вызначыць і назваць агульныя рысы стылю барока ў храмавым дойлідстве беларускіх і італьянскіх майстроў.

## Творчая майстэрня

5. Касцёл Святога Станіслава ў Магілёве з’яўляецца сапраўдным культурным цэнтрам горада і ўсёй Беларусі. З 1993 года храм штогод сустракае ўдзельнікаў і гасцей Міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі. На свята з’язджаюцца аматары класічнай і сучаснай духоўнай культуры з усяго свету. Падчас фестывалю праходзяць выстаўкі, конкурсы, спектаклі, кінасеансы. Прыдумайце і аформіце праграму фестывалю. Уключыце ў яе творы розных відаў мастацтва, з якімі вы пазнаёміліся ў гэтым навучальным годзе.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне